*В.В.КАЛАЦЭЙ*

# ФАРМІРАВАННЕ ТРАДЫЦЫЙНАГА КАЛЕНДАРА БЕЛАРУСАЎ

*Выяўлены характар унёскаў у асноўныя знакавыя і сімвалічныя сістэмы традыцыйнай культуры беларусаў (земляробчы каляндар і генетычна звязаныя з ім этнічныя спевы і харэаграфію) этнасаў старажытнай Усходняй Еўропы. У кантэксце гісторыка-тыпалагічных параўнанняў відавочна, што помнікі мастацтва вуснай традыцыі нашага народа маюць сэнсы, якія захоўваюць трывалую этнаэкалагічную значнасць і важкасць нават сёння, у часы глабалізацыі і урбанізму.*

Семіятычны аналіз сведчыць, што на тэрыторыі Беларусі існуюць тапонімы, этнаграфічныя асаблівасці матэрыяльнай і паводзіннай культуры, якія нельга вытлумачыць зыходзячы выключна са славянскіх гаворак, міфалогіі і фальклору. Гэта – сведчанні надзвычай архаічнага паходжання нашага этнасу, якое сцвярджалі буйныя этнолагі XX ст. [3, с. 195]. Бясспрэчна, XIV стагоддзем датуюць *этап фарміравання беларускай народнасці*, на якім скончылася наша *старажытная гісторыя.* У пісьмовых крыніцах Вялікага княства Літоўскага – фанетыка і марфалогія беларускай мовы, заканадаўчыя асновы жыццеўладкавання, звесткі пра духоўны і культурны стан тагачаснага грамадства. Але культура Беларусі, каб стаць культурай беларускай народнасці, прайшла праз тры этапы рознага этнічнага напаўнення. Э.Загарульскі прапануе наступную іх храналогію [4, с. 65].

| Даіндаеўрапейскі (палеаліт – неаліт) | Балтыйскі (эпоха металу) | Славянскі (Сярэднявечча) |
|---|---|---|
| XX (поўдзень Беларусі) ці X (поўнач Беларусі) тысячагоддзе да н.э. – мяжа III/II тысячагоддзяў да н.э. | Мяжа III/II тысячагоддзяў да н.э.– VI–X стст. н.э. | VI–X стст.– XIV ст. |

Беларусь была заселена ў палеаліце. Паляўнічыя плямёны мезаліту Беларусі (IX–V тысячагоддзі да н.э.) з’яўляліся этнаграфічнымі групамі, якія мелі ўласную мову, тэрыторыю і агульныя рысы культуры. Этнічная мапа захавалася і ў неаліце (IV–III тысячагоддзі да н.э.) пры росквіце суполак жывёлаводаў і земляробаў Старой Еўропы [1, с. 9], межы культур якой (археалагічная культура Кукуцені-Трыполле) даходзілі да Падняпроўя і басейна Прыпяці. Палеажыхары Беларусі мовілі на неіндаеўрапейскіх гаворках: да фіна-ўграў дапасоўваюць мігрантаў на беларускія тэрыторыі ў IV–III тысячагоддзях да н.э. Першыя індаеўрапейцы Беларусі – балты – засялілі яе ў эпоху металу, а славяне рассяліліся тут у Сярэднявеччы. Гэта не значыць, што, напрыклад, фіна-угры па прыходзе балтаў на беларускія землі генетычна і культурна “зніклі”. Яны мяшаліся, “распушчаліся” ў балтыйскім асяродку. Тое ж самае можна сказаць адносна асіміляцыі балтаў славянамі. Пры кантакце з аўтахтонамі мігранты непазбежна ўзбагачалі іх культуру элементамі, вытворнымі ад сваіх семіясістэм (упарадкаваных набораў знакаў і сімвалаў для перадачы інфармацыі ў грамадзе і навакольным асяродку).

Мэта гэтага артыкула – прааналізаваць структуру ўнёскаў этнасаў старажытнай Усходняй Еўропы ў праявы нематэрыяльнай культуры беларусаў, а менавіта ў іх каляндар (адну з найдасканалейшых семіясістэм) і знітаваныя з ім традыцыйныя спевы і харэаграфію.

**Даіндаеўрапейская спадчына.** Аснова беларускай культурнай традыцыі склалася, калі нашы продкі мовілі на неіндаеўрапейскіх гаворках і жылі суполкамі, аб’яднанымі сваяцтвам па лініі маці. Марыя Гімбуцьене даказала, што этнасы Старой Еўропы V–III тысячагоддзяў да н.э. былі суполкамі аселых земляробаў і паляўнічых з тэакратычным кіраваннем, цэнтральным становішчам жанчыны, паглыбленасцю ў мастацтва, сям’ю і святы-рытуалы. Такі тып культуры быў пашыраны ад Міжземнамор’я да Балтыкі. Ужо шчыльна заселеная Беларусь мела земляробства ў мезаліце – неаліце: у V тысячагоддзі да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

н.э. – на поўдні краіны; у IV яго ўплыў дасягаў Гомельшчыны, Міншчыны і Магілёўшчыны; у III тысячагоддзі да н.э. – Брэстчыны і Валыні [8, с. 16].

Каля 10 000 гадоў таму клімат і ландшафт Беларусі ўжо былі блізкія да сённяшніх, усталяваліся "сучасныя" рытмы сезоннасці. Праз назіранні за Сонцам і Месяцам, міграцыяй фауны і флорай з'явіўся *протакаляндар* – прымеркаваная да астральнасці (касмічнай энергіі, што ідзе на Зямлю) сістэма свят і будзённых дзён, што "ўпісала" этнас у ландшафт і біяхімічны рытм прыроды. З земляробствам V–III тысячагоддзяў да н.э. ўсталяваліся святы: месяцава-сонечнага календара, летняга і зімовага сонцавароту. Культ Месяца жывы дагэтуль: "рухомыя святы" (Масленіца, Вялікдзень, Сёмуха) вызначаюць па поўні – трэцяй фазе месяца; Купалле ж раз на 18–19 год супадае з поўняй, і карагоды вакол вогнішчаў гучаць пад "начным сонцам". Месяцава-сонечны каляндар – "жаночы", знітаваны з перадачай ведаў, земляробствам, лекаваннем, сезоннымі назіраннямі. Сярод нашых традыцыйных спеваў і харэаграфіі, у якіх магчыма прыстаўка "палеа", – рэфрэны: купальскія – *Лыгу!*, талакі – *Рана!*, веснавыя – *Лё!, Гу!*; галашэнні на вяселлі і пахаванні; ангемітонныя музычныя лады і карагодная традыцыя. У святочных шэсцях і танцах Старой Еўропы па алеях да мегалітаў Мальты, Францыі, Іспаніі, Брытаніі рухаліся тысячы чалавек. Пляцоўкі для танцаў – лабірынты – былі ў Італіі і Польшчы. Працэсіі, прысвечаныя плоднасці і продкам, дагэтуль ладзяць на другі маладзік вясны ў падняпроўскай Страле. Увогуле, у карагодах Еўразіі – "мультыкарані" яе мастацтва. Старшынямі выканальніцкіх суполак былі першыя паэты. Пад іх вершы (лац. versus, стараграэч. strophē – вярчэнне) вялі танок вакол ахвярніка ці полымя. З працэсій сінтэзаваўся тэатр; з культавых тэкстаў – літаратура; з інтанавання верша – спевы; з рытмаваных рухаў і іх шумавога суправаджэння – інструментальная музыка [2, с. 12–34].

**Балцкія вытокі.** У эпоху металу ў IV–III тысячагоддзях да н.э. Старая Еўропа схілілася пад націскам стэпавых індаарыйскіх і індаіранскіх народаў. Яе традыцыя аселых земляробаў, скіраваная на пантэізм, тэакратыю, матрыярхат, "пахіснулася". Усходнееўрапейскі рэгіён падзяліў гэты лёс: Балтыку, Ютландыю, Карпаты і Валынь на мяжы III/II тысячагоддзяў да н.э. занялі намады-протаіндаеўрапейцы – продкі германцаў, балтаў і славян – з політэізмам, патрыярхатам і ваеннай алігархіяй на чале грамадства. На Беларусі прадстаўнікі сярэднедняпроўскай археалагічнай культуры (канец III тысячагоддзя да н.э.) ужо з'яўляліся носьбітамі *балцкіх* моў (па ўзросце апошнія роўныя з мовай готаў, лацінай і санскрытам). Народы "жывых" моў балтаў – літоўцы і латышы – сёння налічваюць адпаведна 3,4 млн. і 2 млн. чалавек. Тэакратычна кіруемыя з часоў Старой Еўропы жрацамі-вайдэлотамі прусы, якія мясціліся вакол сучаснага Калінінграда (ва Ульмерыгіі), былі вынішчаны ў XIV ст. Тэўтонскім ордэнам.

Індаеўрапейцы – вогне- і сонцапаклоннікі. Але старыя сакральныя цэнтры Ульмерыгіі ў эпоху металу буялі, намады не пазбавілі іх улады. Да Сярэднявечча "прусы, ліцвіны (літоўцы і беларусы), народы зямлі лівонскай (латышы)" прызнавалі аўтарытэт Krive [7, с. 51] – вярхоўнага жраца вайдэлотаў. Балтыка была вядома ў элiністычнай айкумене, і ва Ульмерыгію вандравалі за бурштынам рымляне. І хаця Тацыт лічыў тубыльцаў "вернікамі Вялікай маці багоў", у эпоху металу монатэізм багіні Месяца не мог не быць пасунуты *політэізмам* ведычнага і зараастрыйскага тыпу з мужчынскімі боствамі, і Еўропа ад тых часоў лічыць час праз *сонечны каляндар*. Ён знітаваны з паляўнічым і жывёлаводным (мужчынскім) промыслам, гандлем і абапіраецца на "Сонечны крыж": ВВР – веснавое (21.03) і ВСР – восеньскае (21.09) раўнадзенствы + ЛСВ – летні (22.06) і ЗСВ – зімовы (22.12) сонцаварот. Гэтыя даты – галоўныя, ад якіх лічаць час і ладзяць жыццё дагэтуль. У балтаў: ВВР – літ. Pavasario ligė, Velikos; ЛСВ – лтш. Lygo (літ. Kupolių Švente); ВСР – літ. Dagotuves, Diedai; ЗСВ – літ. Kaledų Švente (лтш. Kalada). З беларускімі падобны не толькі іх назвы, але і змест, сімвалы свят. У галіне традыцыйных спеваў і харэаграфіі няма двух больш падобных народаў, чым беларусы і літоўцы. Агульныя (за выключэннем фанетыкі) жанры песень: *валачобныя* (ёсць толькі ў беларусаў і літоўцаў), *юраўскія, жніўныя* ("у працэсе" жніва спяваюць толькі беларускі і літоўкі). Шмат агульнага – у купальскіх, вясельных, калядных і восеньскіх. Падобную лексіку маюць традыцыйныя танцы.

**Славянскія карані.** З эпохай Вялікага перасялення народаў (V ст.) на балтамоўных беларускіх землях ў VI–X стст. з'явіліся славяне. Яны – індаеўрапейцы, іх прарадзіма – Карпаты і Валынь, куды ў III–II тысячагоддзях да н.э. мігравалі намады-арыяфоны са

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стэпаў Ніжняй Волгі. Пазней – з ІІ тыс. да н.э. да VI–VII стст. н.э. славяне рассяліліся ва Усходняй і Цэнтральнай Еўропе, на Балканах [1, с. 31]; кіруемыя цюркскай і скандынаўскай алігархіяй утварылі шэраг дзяржаў (Вялікую Маравію, Кіеўскую Русь, Балгарскае ханства, Польскае каралеўства). Разнастайнасць славянскіх нацый знітавана з асаблівасцямі культур, з якімі яны кантактавалі ў час рассялення: фарміраванне рускай мовы і культуры абумовілі кантакты славян з фіна-уграмі; украінскай – са скіфа-сарматамі; беларускай – з балтамі.

*Мясцовы каляндар* змяніўся не моцна: славяне, як і балты, былі політэістамі да мяжы І/ІІ стст., а аснову часаўспрымання мясцовых земляробаў фундаваў адвечны паўтор вегетацыйнага цыкла, знітаваны з месяцава-сонечным календаром. Аднак патрыярхальна-алігархічная сацыяльная арганізацыя патрабавала адпаведнай ідэалогіі, і ў 863 г. хрысціянства зацвердзілася ў Вялікай Маравіі, у 885 г. яго прыняло Балгарскае ханства, у 966 г. – Каралеўства Польскае, у 988 г. – Кіеўская дзяржава. З Беларуссю яна кантактавала і раней – праз гоцкіх (арыянскіх) і скандынаўскіх місіянераў. Паўночна-заходнія беларускія землі (*польск.* Litwa) разам з літоўскімі (*польск.* Żmudź) у выглядзе моцнай дзяржавы – Вялікага княства Літоўскага – да XIVст. захоўвалі політэізм як афіцыйную рэлігію, і апошнія Krive знайшлі паратунак ад крыжакоў пры віленскім двары [6, с. 306]. Пытанне: "Чаму святы хрысціян сумясціліся з мясцовымі?" – мае наступнае тлумачэнне. Да Сярэднявечча Царква шмат запазычыла ад абраднасці мітраізму (культ Мітры – *лац.* sol invictus deus – "Непераможнага Сонца" ў 270–350 гг. афіцыйны культ рымскіх імператараў, разнесены іх легіёнамі ад Афрыкі да Брытаніі), пабудаванай на святах "Сонечнага крыжа", як і ведычныя, і зараастрыйская традыцыі, адкуль родам пантэоны балтаў, германцаў і славян. Імкненне ж да панавання ў Еўропе схіляла біскупаў да авалодання тэхналогіямі хрысціянізацыі праз стварэнне нацыянальных алфавітаў (місія Канстанціна Салунскага – Святога Кірылы – у Вялікую Маравію); асвячэнне абсалютызму новых дзяржаў (хрост Уладзіміра і Ягайлы); вынішчэнне "пад корань" народаў, трывалых у старой веры (паморскіх славян в. Руген і прусаў Ульмерыгіі). З пачаткам хрысціянізацыі Вялікага княства Літоўскага – 1385 г. – пачалася "апошняя рэдакцыя" назваў свят на Беларусі, і іх сінтэз (кампраміс) з Царквой. У аснове календара застаўся "Сонечны крыж" і яго абрады, толькі Ligo змянілася на Купалле. Яго этымалогія – ад *старабел.* копа 'яднаная супольнасць' ці *стараслав.* купіна 'куст', што сцвярджае славянскасць свята "Куст", дзе назва абраду паходзіць ад абазначэнняў культу продкаў (*сербахарв.* kuca, 'дом', kuca zadruzna, 'аб'яднаная сям'я'). У рытуальных *спевах і харэаграфіі* лічаць славянскімі: рытмаформулу "проса" карагодаў і амаль ўсёй песеннай спадчыны паўднёвай і ўсходняй Беларусі; песні – духоўныя вершы лірнікаў з біблейскімі персанажамі (Лазарам, святым Юр'ем, святым Гаўрылам, святым Міхайлам); палескі "коровай", дзе вясельны пірог замяніў рытуальную ежу 'з кароў' – з гавяды; з побытавых танцаў – польку, радзіма якой Чэхія.

Структура фарміравання традыцыйнага календара беларусаў і знітаваных з ім жанраў традыцыйных спеваў і харэаграфіі выглядае наступным чынам.

| Семіясістэмы традыцыйнай культуры беларусаў | Адбіткі ў семіясістэмах этапаў старажытнай гісторыі Беларусі | | |
|---|---|---|---|
| | даіндаеўрапейскага (неаліт) | балтыйскага (эпоха металу) | славянскага (Сярэднявечча) |
| Традыцыйны земляробчы каляндар | святы "жаночага" месяцава-сонечнага календара; святы двух сонцаваротаў | агульная "мужчынская" структурная арганізацыя (з асновай – "Сонечным крыжам"); яго галоўныя святочныя комплексы | апошняя рэдакцыя назваў асноўных этнічных свят, іх кампраміс з абрадамі Царквы |
| Традыцыйныя спевы і харэаграфія | ангемітонныя напевы; рэфрэны Купалля "Лыгу!" і талакі "Рана!"; песні | спевы агульных (за выключэннем фанетыкі мовы) святочна-абрада- | жанр духоўных вершаў; большасць традыцыйна-побытавых танцаў |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | |
|---|---|---|---|
| | жніва; карагодная традыцыя | вых комплексаў: веліконднага, юраўскага, жніўнага | |


1. *Гимбутас, М.* Славяне / М.Гимбутас; пер. с англ. Ф.С.Капицы. – М.: Центрполиграф, 2003. – 216 с.

2. *Грейвс, Р.* Белая богиня: избр. главы / Р.Грейвс; предисл. Х.Л.Борхеса; пер. с англ. И.Егорова. – СПб.:Амфора, 2000. – 382 с.

3. *Гумилёв, Л.Н.* Этногенез и биосфера земли / Л.Н.Гумилёв. – М.: АСТ, 2001. – 310 с.

4. *Загорульский, Э.* Этапы заселения Белоруссии / Э.Загорульский. – Мн.: РИВШГО, 1996. – 116 с.

5. *Кулаков, В.И.* Исторические маршруты по землям пруссов / В.И.Кулаков // Дорогами Ульмеригии: ист. путеводитель / В.И.Кулаков. – Калининград : Б-К, 2000. – С. 106–265.

6. *Пенник, Н.* Древняя Пруссия и Балтийское побережье / Н.Пенник, П.Джонс // История языческой Европы / Н.Пенник, П.Джонс; пер. с англ. Р.В.Котенко. – СПб.: Евразия, 2000. – С. 302–307.

7. *Пётр из Дусбурга.* Хроника земли Прусской / Пётр из Дусбурга. – М.: МГУ, 1997. – 145 с.

8. *Поболь, Л.Д.* Древности Туровщины /Л.Д.Поболь; науч. ред. О.Н.Левко. – 2-е изд., доп. и перераб. – Мн.: Бел. навука, 2004. – 143 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ